А.Б. Сташкевіч,
начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння
дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Актуальныя пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў адукацыйных праграмах дадатковай адукацыі дарослых

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны адносіцца да сферы культурнай дзейнасці і як тэма можа выкладацца для розных катэгорый практыкаў культуры, а не толькі для прафесіяналаў, што непасрэдна займаюцца захаваннем спадчыны. Гэта абумоўлена шырокім кантэкстам паняцця «культурная спадчына», які закранае практычна ўсе сферы чалавечага існавання: ад побыту да правядзення вольнага часу.

Са шматлікіх дэфініцый, якія сёння прапануюцца ў навуковай літаратуры, выбіраем агульнае тлумачэнне паняцця «культурная спадчына», прапанаванае Міжнароднай Радай па захаванню помнікаў і памятных мясцін (ICOMOS). Згодна з ім *культурная спадчына* — форма культурнай экспрэсіі, створаная чалавечымі грамадствамі, якая перадаецца ад пакалення да пакалення і з'яўляецца асновай фарміравання нацыянальнай, рэгіянальнай альбо лакальнай ідэнтычнасці і самапавагі. Яна ўключае ў тым ліку традыцыі, практыкі, гістарычныя аб'екты і культурныя ландшафты, мастацкія творы і матэрыяльныя прадметы, іншыя культурныя праяўленні і каштоўнасці. Падзяляецца на матэрыяльную і нематэрыяльную [5].

Краевугольны камень усіх існуючых дэфініцый «культурнай спадчыны» — гэта творчасць чалавека, прызначэнне якой — перадача ведаў [5]. Такім чынам, гнасеалагічны характар культурнай спадчыны абумоўлены яе прыродай. *Яна валодае магутным адукацыйным патэнцыялам, які неабходна выкарыстоўваць для шырокай сацыяльнай адукацыі і выхавання*, у тым ліку і праз развіццё культурнага турызму.

Англійскі гісторык архітэктуры Сайман Тарлей у 2005 г. прапанаваў так званы Цыкл спадчыны, які дае нам пэўныя рэкамендацыі адносна таго, як найлепшым чынам выкарыстоўваць мінулае для фарміравання будучыні. Першая ступень цыкла — разуменне культурнай спадчыны (людзі пачынаюць усведамляць яе каштоўнасць); на другой ступені — ацэньванне (людзі жадаюць клапаціцца пра яе); на трэцяй — захаванне (людзям падабаецца захоўваць спадчыну); на чацвёртай ступені — неабходнасць захавання (у людзей выпрацоўваецца жаданне захоўваць спадчыну) [8]. На наш погляд, менавіта ў такім кантэксце варта гаварыць пра спадчыну з шырокай публікай, але не менш важна выкарыстоўваць дадзеную парадыгму пры распрацоўцы праграм ДАД для павышэння кваліфікацыі спецыялістаў у галіне культурнай спадчыны, бо, як вядома, усё, што прапушчана праз прызму ўласных пачуццяў, спрыяе пазнанню і фарміруе ўстойлівыя матывацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі па напрамку «Гісторыка-культурная спадчына» разлічана на спецыялістаў, якія непасрэдна ажыццяўляюць яе ахову на месцах і ад якіх залежыць рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў сферы яе захавання. Для таго, каб гэты працэс быў эфектыўным, неабходна выкананне дзвюх умоў: па-першае, ён павінен ажыццяўляцца прафесіяналамі, якія валодаюць тэарэтычнымі і практычнымі ведамі, а таксама адпаведным інструментарыем для іх прымянення; па-другое, да яго трэба далучаць шырокую грамадскасць. Спецыялісты, выкарыстоўваючы патэнцыял спадчыны, павінны займацца выхаваннем людзей, фарміруючы ў іх сацыяльныя матывацыі, жаданне даследаваць і захоўваць гісторыка-культурныя каштоўнасці непасрэдна ў месцы пражывання [6].

Павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны павінна вырашаць наступныя задачы: паглыбленне і пашырэнне іх прафесійнай кампетэнтнасці з улікам актуальных тэндэнцый і авалоданне сучаснымі тэхналогіямі і методыкамі для правядзення кампаніі публічнага інфармавання і ажыццяўлення шырокай грамадскай адукацыі на патэнцыяле спадчыны.

Адукацыйная праграма дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» адрасавана найперш спецыялістам музеяў.

Праграма мяркуе вывучэнне тэарэтычных пытанняў, на якіх грунтуецца сістэма аховы спадчыны. Яны ў асноўным знаходзяцца ў рэчышчы даследаванняў па культуры памяці, яе сацыяльных рамак, «месцаў памяці», тэрміналогіі і метадалогіі навук, звязаных з захаваннем культурных каштоўнасцей. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Рэспубліка Беларусь, як вядома, ратыфікавала большасць канвенцый ЮНЕСКА, прысвечаных культурнай спадчыне, і паспяхова рэалізуе іх палажэнні як на заканадаўчым, так і на ўзроўні штодзённай ахоўнай практыкі. Добрае веданне нарматыўнай базы, яе паспяховае прымяненне ў прафесійнай дзейнасці — аснова работы для любога спецыяліста.

Практычны аспект праграмы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны з’яўляецца прыярытэтным. У час заняткаў адбываецца абмен вопытам паміж слухачамі, аналізуюцца праблемы, якія ўзнікаюць у працэсе іх прафесійнай дзейнасці, сумесна выпрацоўваюцца магчымыя шляхі іх вырашэння. Як правіла, з гэтай мэтай выкарыстоўваецца праектны метад, у аснове якога ляжыць развіццё пазнавальных, творчых навыкаў і ўменняў слухачоў самастойна канструяваць свае веды і арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, а таксама крытычна мысліць [1].

Праектны метад, які быў распрацаваны амерыканскім філосафам і педагогам Дж. Дзьі і яго вучнем В.Х. Кілпатрыкам, пабудаваны на інтэрактыўнай платформе, прадугледжвае рашэнне праблемы на падставе інтэграцыі разнастайных ведаў, з аднаго боку, а з другога — на падставе здольнасцей самастойна канструяваць свае веды, хутка шукаць рашэнні [2]. Вынікі выкананых праектаў павінны быць «адчувальнымі», прапаноўваць канкрэтнае рашэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца па метаду праектаў прадугледжвае не толькі наяўнасць і ўсведамленне пэўнай праблемы, але і працэс яе раскрыцця, рашэнне, што ўключае дакладнае планаванне дзеянняў, наяўнасць задумы або гіпотэзы вырашэння праблемы, дакладнае размеркаванне (калі маецца на ўвазе групавая праца) роляў, заданняў для кожнага ўдзельніка пры ўмове цеснага ўзаемадзеяння [4].

Метад праектаў выкарыстоўваецца ў тым выпадку, калі ў адукацыйным працэсе ўзнікае пэўная творчая задача, для вырашэння якой неабходна прымяненне даследчых методык (напрыклад, параўнальнае даследаванне стану гісторыка-культурных каштоўнасцей у розных рэгіёнах краіны ці распрацоўка стратэгіі інтэграцыі культурнай спадчыны ў сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна).

Праца над праектам старанна плануецца выкладчыкам і абмяркоўваецца са слухачамі. Пры гэтым праводзіцца падрабязнае структураванне змястоўнай часткі праекта з указаннем паэтапных вынікаў і тэрмінаў прадстаўлення вынікаў.

Уся дзейнасць слухачоў засяроджваецца на наступных этапах:

вызначэнне праблемы і асноўных кірункаў яе даследавання;

вылучэнне шляхоў рашэння праблемы;

абмеркаванне метадаў даследавання;

правядзенне збору даных;

аналіз атрыманых даных;

афармленне канчатковых вынікаў;

падвядзенне вынікаў.

У працэсе сумеснага даследавання выкарыстоўваюцца разнастайныя метады, напрыклад, «мазгавы штурм», статыстычныя метады, творчыя справаздачы, прагляды і інш.

Трэнінгавая методыка і іншыя інтэрактыўныя формы ўзаемадзеяння педагога і слухачоў шырока выкарыстоўваюцца Інбелкультам пры правядзенні семінараў па актуальнай тэматыцы. Падчас іх падрыхтоўкі і (ці) па выніках рыхтуюцца інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. Так, па засваенню методыкі інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Інбелкультам падрыхтавана і выдадзена «Практычнае кіраўніцтва па ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны» [3]. Вынікам семінараў стала стварэнне карэспандэнцкай сеткі (рэгіёны — цэнтр), задача якой — збор інфармацыі і сістэматычнае вядзенне Нацыянальнага інвентару нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі [7].

Культурная спадчына фарміруе самасвядомасць, стварае аснову для інклюзіўнага развіцця, арыентаванага на інтарэсы чалавека. Устойлівае развіццё без зберажэння і выкарыстання культурнай спадчыны немагчыма. Менавіта таму культурная спадчына, як і культура, цалкам сёння стаіць у цэнтры задачы развіцця грамадства і з'яўляецца найважнейшым укладам у будучыню свету, перадумовай да паспяховых працэсаў глабалізацыі на падставе прынцыпаў культурнай разнастайнасці. Гэта канцэпцыя знаходзіцца ў аснове новай павесткі дня ААН у галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 г., у якой упершыню культура разглядаецца як дзейсны фактар дасягнення мэт устойлівага развіцця, які тычыцца адукацыі, экалогіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічнага росту гарадоў, устойлівых мадэлей спажывання і вытворчасці харчовай бяспекі, пабудовы мірных і інклюзіўных супольнасцей [9].

ЮНЕСКА прывітала новыя ініцыятывы ААН і адзначае вялікае значэнне культурнай адукацыі для ўстойлівага развіцця, якое па меркаванню Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Ірыны Бокавай, «грунтуецца на ўзаемасувязі навакольнага асяроддзя, эканомікі, грамадства і культурнай разнастайнасці, што разам утвараюць ключ да больш справядлівага свету ў XXI стагоддзя» [9]. Сусветная арганізацыя таксама падкрэслівае, што ў адукацыйныя праграмы сёння неабходна ўключаць перадачу мясцовага культурнага вопыту і сістэмы ведаў, якія назапашаны многімі пакаленнямі людзей і з'яўляюцца надзвычай важным элементам для захавання культурнай спадчыны і фарміравання нацыянальнай, рэгіянальнай і лакальнай ідэнтычнасці.

Такім чынам, змест адукацыйнай праграмы ДАД па напрамку «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» павінен, па-першае, быць накіраваны на павышэнне прафесійных і асобасных кампетэнцый у гэтай сферы, авалодванне сістэмай ведаў з улікам сучасных тэндэнцый, міжнароднага вопыту і патрабаванняў, а па-другое, развіваць устойлівыя навыкі творчага мыслення і эфектыўнага менеджменту за кошт прымянення сучасных інавацыйных методык і праектнага падыходу.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Алексеев, Н.Г.* Проектирование / Н.Г. Алексеев; ред.-сост. Н.Б. Крылова // Новые ценности образования : тезаурус для учителей и школьных психологов. — М. : ИПИ РАО, 1995. — С. 61—62.
2. *Вульфсон, Б.Л.* Джон Дьюи и советская педагогика / Б.Л. Вульфсон. — М. : Педагогика, 1992. — № 9—10.
3. Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадыны : Практычнае кіраўніцтва / А. Сташкевіч [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. — 164 с. : іл.
4. Метод проектов // Белорус. гос. ун-т. Центр проблем развития образования. Респуб. ин-т высшей школы БГУ. — Мінск : РИВШ БГУ, 2003. — Вып. 2. — 240 с. — (Сер. «Современные технологии университетского образования».)
5. ICOMOS, International Cultural Tourism Charter. Principles And Guidelines For Managing Tourism At Places Of Cultural And Heritage Significance. *ICOMOS International Cultural Tourism Committee, 2002.*
6. John Feather, Managing the documentary heritage: issues fro the present and future. In: (Gorman, G.E. and Sydney J. Shep [eds.]) / Preservation management for libraries, archives and museums. — London : Facet, 2006. — P. 1—18.
7. Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі [Электронный рэсурс]. — Рэжым доступу : http://livingheritage.by. — Дата доступу : 10.05.2016.
8. Simon Thurley, Into the Future. Our stategy for 2005—2010. In: *Conservation Bulletin* [English Heritage], 2005 (49).
9. ЮНЕСКО [Электронный рэсурс]. — Рэжым доступу : http://ru.unesco.org/sdgs. — Дата доступу : 10.05.2016.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ